


# § 44. Брэсцкая вобласць

***Успомніце.*** *На колькі абласцей падзяляецца тэрыторыя Беларусі?*

Комплексная эканоміка-геаграфічная характарыстыка рэгіёна даецца па агульнапрынятым у геаграфіі плане (мал. 143).




Мал. 143. План характарыстыкі адміністрацыйнага рэгіёна

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па велічыні валавога рэгіянальнага прадукту (ВРП) Брэсцкая вобласць займае чацвёртае месца ў Беларусі. Удзельная вага ВРП Брэсцкай вобласці ў фарміраванні ВУП краіны складае 11,3 % (мал. 144).




Мал. 144. Удзельная вага ВРП абласцей і г. Мінска ў фарміраванні ВУП краіны, 2023 г., %




Мал. 145. Удзельная вага абласцей і г. Мінска ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці (*а*) і вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі (*б*), 2023 г., %

Брэсцкая вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на пятым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на другім (мал. 145).

Па карце атласа (с. 73) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Брэсцкая вобласць займае паўднёва-заходнюю частку Беларусі на мяжы з Польшчай і Украінай. Яе плошча складае 32,8 тыс. км$^2$. У вобласці знаходзіцца самы заходні пункт краіны. Транзітнасцю вобласці абумоўлена выгаднасць геаграфічнага становішча.

Па якім прыродным рубяжы праходзіць частка мяжы Брэсцкай вобласці?

**3. Прыродныя рэсурсы.** Вобласць дастаткова добра забяспечана мінеральнымі рэсурсамі. З карысных выкапняў вылучаюцца найбуйнейшыя ў краіне радовішчы будаўнічага каменю каля Мікашэвічаў. У межах вобласці здабываюцца тугаплаўкія гліны ў Столінскім раёне. Разведаны радовішчы мелу і фасфарытаў. Распрацоўваюцца буйныя радовішчы цагельных і керамічных глін, пясчана-жвіровых сумесей, будаўнічага пяску. Па ўсёй тэрыторыі вобласці сустракаюцца радовішчы торфу.

На карце атласа (с. 73) знайдзіце радовішчы карысных выкапняў.

Вобласць размяшчаецца ў межах Палескай нізіны і раўнін Перадпалесся. Сельскагаспадарчыя землі займаюць больш за 41 % тэрыторыі, што перавышае сярэдні паказчык па краіне. Па долі ворных зямель

Брэсцкая вобласць саступае толькі Мінскай і Гродзенскай. Шырока распаўсюджаны тарфяна-балотныя глебы (19 %). Больш за 50 % зямель меліяравана.

Брэсцкая вобласць забяспечана аграклiматычнымі рэсурсамі. Тут самы працяглы вегетацыйны перыяд, самыя вялікія сумы тэмператур, цёплае лета, мяккая зіма, адносна невялікая колькасць ападкаў (550–650 мм). Нягледзячы на рэдкую гідраграфічную сетку, вобласць багатая на водныя рэсурсы. Па яе тэрыторыі працякаюць рэкі Прыпяць, Заходні Буг і Шчара. Буйныя азёры рэшткавага тыпу (Выганашчанскае, Чорнае, Спораўскае і інш.) знаходзяцца ў цэнтральнай частцы вобласці, у поймах рэк шмат азёр-старыц. Па плошчы вадасховішчаў і сажалак, якія выкарыстоўваюцца ў рыбнай гаспадарцы, вобласць саступае толькі Мінскай. Важнае транспартнае значэнне мае Дняпроўска-Бугскі канал.

Назавіце буйныя прыродаахоўныя тэрыторыі вобласці.

Ляснымі рэсурсамі вобласць забяспечана слаба. Лясістасць адна з найменшых у Беларусі — 36,3 %. Самая высокая доля (больш за 15 %) зямель занята прыродаахоўнымі тэрыторыямі.

**4. Насельніцтва.** Колькасць насельніцтва ў Брэсцкай вобласці — 1308,6 тыс. чалавек (чацвёртае месца). Тэрыторыя заселена раўнамерна. Шчыльнасць насельніцтва складае 40 чал./км$^2$ і нязначна памяншаецца з захаду на ўсход. Гарадское насельніцтва складае 72 % агульнай колькасці насельніцтва вобласці. У вобласці даволі вялікая доля ўкраінцаў (каля 3 %).

**5. Прамысловасць.** На долю прамысловасці ў структуры ВРП Брэсцкай вобласці прыпадае 25,3 % (мал. 146). У Брэсцкай вобласці знаходзіцца больш за 1800 прамысловых прадпрыемстваў. Больш за 80 % прамысловай прадукцыі даюць Брэст, Баранавічы, Пінск, Кобрын, Бяроза і Лунінец.




Мал. 146. Структура ВРП Брэсцкай вобласці, 2023 г., %

Назавіце прадпрыемствы харчовай прамысловасці Брэсцкай вобласці. У якіх гарадах яны размешчаны?

Вядучае месца ў структуры апрацоўчай прамысловасці займае харчовая прамысловасць. Вобласць — буйны вытворца мяса і каўбасных вырабаў, малочных прадуктаў, сыроў, цукру, рыбы і морапрадуктаў.

У 2025 г. прадукцыя Брэсцкага мясакамбіната адзначана Дзяржаўным знакам якасці.

Вобласць спецыялізуецца на вытворчасці прадукцыі машынабудавання: лямпаў напальвання, акумулятараў, бытавых электрычных і газавых пліт. Развіта хімічная вытворчасць. Выпускаецца прадукцыя бытавой хіміі, вырабы з пластмасы, прадукцыя мікрабіялагічнай і фармакалагічнай прамысловасці. У вобласці вырабляюць фанеру, мэблю, лыжы.

Па карце атласа (с. 73) вызначце цэнтры вытворчасці машынабудавання, хімічнай і дрэваапрацоўчай прамысловасці Брэсцкай вобласці.

Атрымала развіццё тэкстыльная, швейная і абутковая прамысловасць. Буйныя прадпрыемствы па вытворчасці баваўняных тканін знаходзяцца ў Баранавічах, трыкатажных — у Пінску, панчошна-шкарпэткавых вырабаў — у Брэсце.

Вобласць спецыялізуецца на вытворчасці электраэнергіі. Бярозаўская ДРЭС у Белаазёрску — трэцяя па магутнасці ў краіне. Горназдабыўная прамысловасць развіта слаба. Найбуйнейшае прадпрыемства галіны, «Граніт» у Мікашэвічах, вырабляе друз і будаўнічы камень.

**6. Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП вобласці на долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі прыпадае 14,6 %. Вобласць спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, збожжавай гаспадарцы ў спалучэнні з кормавытворчасцю, вырошчванні буракоў, рапсу і агародніцтве. У структуры пасяўных плошчаў збожжавыя і кармавыя культуры займаюць па 44 %. Змены клімату абумовілі пашырэнне пасеваў кукурузы на зерне. У вобласці спрыяльныя ўмовы для вырошчвання бульбы і цукровых буракоў, развіцця садоўніцтва і агародніцтва. Развіта птушкагадоўля, асабліва ў Баранавіцкім раёне, авечкагадоўля (больш за 1/2 пагалоўя авечак краіны). Па валавой вытворчасці мяса, малака, гародніны Брэсцкая вобласць саступае толькі Мінскай.

**7. Геаграфія сферы паслуг.** Памежнае размяшчэнне Брэсцкай вобласці абумовіла вялікія аб'ёмы транспартных паслуг. Праз вобласць праходзяць галоўныя чыгуначныя магістралі з Брэста на Маскву і Гомель, па якіх перамяшчаецца вялікая колькасць грузаў. Гушчыня сеткі чыгунак — амаль 31 км/1000 км$^2$, а аўтамабільных дарог з цвёрдым пакрыццём — каля 385 км/1000 км$^2$. Па агульнай працягласці чыгунак вобласць саступае толькі Віцебскай, а па гушчыні — лідар у краіне. Актыўна выкарыстоўваецца водны транспарт на Прыпяці і Дняпроўска-Бугскім канале. Праз вобласць праходзяць магістральныя нафта- і газаправоды ў Заходнюю Еўропу. Створаны лагістычныя цэнтры ў Брэсце, Пінску і Івацэвічах. У Баранавічах дзейнічае найбуйнейшы гандлёва-размеркавальны цэнтр «Еўрагандаль».

Якія гарады Брэсцкай вобласці з'яўляюцца найбуйнейшымі чыгуначнымі вузламі?

У вобласці атрымалі развіццё многія галіны сферы паслуг. Тут функцыянуюць чатыры ўстановы вышэйшай адукацыі, больш за 30 каледжаў і ліцэяў. Шмат рэкрэацыйных аб'ектаў, санаторна-курортных і аздараўленчых устаноў, спартыўных аб'ектаў.

Самыя вядомыя архітэктурныя помнікі Брэсцкай вобласці: мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», археалагічны музей «Бярэсце» — адзіны ў Еўропе музей сярэдневяковага ўсходнеславянскага горада, Камянецкая вежа, гісторыка-мемарыяльны музей «Сядзіба Нямцэвічаў», Касаўскі палацава-паркавы ансамбль, Ружанскі палацавы комплекс роду Сапегаў, палац Бутрымовіча ў Пінску (мал. 147). Белавежская пушча і Дуга Струвэ з'яўляюцца помнікамі Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У 2017 г. на ваду ракі Прыпяць спушчаны першы ў Беларусі круізны цеплаход «Белая Русь».



*а*



*б*

Мал. 147. Помнікі архітэктуры Брэсцкай вобласці:
*а* — мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»;
*б* — гісторыка-мемарыяльны музей «Сядзіба Нямцэвічаў», в. Скокі, Брэсцкі раён

Прааналізуйце карты атласа (с. 61–71) і знайдзіце аб’екты сферы паслуг вобласці.

**8. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці.** Абласны цэнтр **Брэст** размяшчаецца пры ўпадзенні Мухаўца ў Заходні Буг каля дзяржаўнай мяжы з Польшчай. У горадзе пражывае больш за 344 тыс. чалавек (шостае месца ў краіне).

Брэст — адзін са старажытных гарадоў Беларусі, сімвал стойкасці і мужнасці савецкіх воінаў. За гераічную абарону летам 1941 г. Брэсцкай крэпасці прысвоена званне крэпасці-героя.

Брэст — буйны транспартны вузел, прамысловы і культурны цэнтр. Прамысловы профіль горада вызначаюць прадпрыемствы машынабудавання, хімічнай і лёгкай прамысловасці. Далёка за межамі Брэста вядомая прадукцыя прадпрыемстваў харчовай прамысловасці «Санта-Брэмар», «Савушкін прадукт», «ІнкаФуд». Для пашырэння экспарту тавараў створана свабодная эканамічная зона «Брэст».

Успомніце, якія прадпрыемствы дадзеных галін размешчаны ў Брэсце.

На паўночным усходзе вобласці знаходзіцца другі па велічыні горад **Баранавічы** (больш за 171 тыс. жыхароў). Гэта буйны чыгуначны вузел, прамысловы і культурны цэнтр Беларусі. Сярод буйных прадпрыемстваў — Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб’яднанне, якое выпускае прадукцыю пад маркай «Блакіт». Калекцыяй паравозаў вядомы музей гісторыі Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі.

Якая яшчэ прадукцыя выпрацоўваецца ў Баранавічах? Назавіце прадпрыемствы.

Каля зліцця Піны і Прыпяці размясціўся горад **Пінск** (больш за 124 тыс. жыхароў). Пінск — прамысловы цэнтр з прадпрыемствамі харчовай, лёгкай, дрэваапрацоўчай, станкабудаўнічай і суднабудаўнічай прамысловасці. У краіне і за яе межамі карыстаецца попытам прадукцыя трыкатажнай фабрыкі «Палессе», мэбля «Пінскдрэў».

Пінск называюць горадам-музеем пад адкрытым небам і сталіцай Беларускага Палесся (мал. 148). Ён другі ў краіне па колькасці славутасцей і помнікаў архітэктуры, якія захаваліся.



Мал. 148. Горад Пінск

Значныя гарады вобласці: Кобрын, Лунінец, Бяроза, Івацэвічы.

**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** Брэсцкая вобласць экспартуе малочную, мясную і рыбную прадукцыю, мэблю, газавыя і электрычныя пліты, алей рапсавы.

**Падвядзём вынікі.** Брэсцкая вобласць займае выгаднае геаграфічнае становішча на паўднёвым захадзе краіны. Асноўныя галіны прамысловасці — харчовая і машынабудаванне. Брэсцкая вобласць спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, збожжавай гаспадарцы і вырошчванні буракоў.

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асаблівасці геаграфічнага становішча вобласці. 2. У чым асаблівасць рассялення насельніцтва ў вобласці і чаму? 3. Якая спецыялізацыя прамысловасці Брэсцкай вобласці?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Як будзе змяняцца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі вобласці ў сувязі з пацяпленнем клімату? 2. Якія новыя галіны прамысловасці найбольш перспектыўныя ў вобласці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Складзіце калаж з этыкетак прадукцыі, якая з'яўляецца брэндам вобласці. 2. Падрыхтуйце паведамленні або мультымедыйныя прэзентацыі пра гарады вобласці.

## § 45. Віцебская вобласць

***Успомніце.*** *З чым звязаны асаблівасці прыродных умоў і прыродных рэсурсаў Віцебскай вобласці?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па велічыні валавога рэгіянальнага прадукту Віцебская вобласць пераўзыходзіць толькі Магілёўскую. Удзельная вага ВРП складае 9,1 % ад рэспубліканскага. Віцебская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на чацвёртым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на пятым (мал. 145).

Па карце атласа (с. 75) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча.** Віцебская вобласць займае паўночную частку Беларусі на мяжы з Літвой, Латвіяй і Расіяй. Тут знаходзіцца самы паўночны пункт краіны. Плошча вобласці — 40,1 тыс. км$^2$ (трэцяе месца пасля Гомельскай і Мінскай). Тэрыторыю вобласці перасякаюць транс'еўрапейскія транспартныя калідоры, магістральныя нафтаправоды і нафтапрадуктаправоды, даволі шмат памежных пераходаў і лагістычных